

Грамадска-палітычная газета для жыхароў Бялыніцкага, Круглянскага і Шклоўскага раёнаў

Рэгіён

ТРАВЕНЬ 2014 г. № 4 (45)

НАВІНЫ РЭГІЁНА

Министр предлагает объединить часть районов Могилевской области.

Министр экономики Николай Снопков предлагает объединить районы Кричевский с Чериковским, Костюковичский с Краснопольским, Климовичский с Хотимским, что даст дополнительный импульс развитию на основе концентрации производственных, инвестиционных и трудовых ресурсов.

Об этом он доложил 25 апреля на совещании у Президента Беларуси по выполнению поручения по социально-экономическому развитию юго-восточных районов Могилевской области, состоявшемся в Климовичах.

Среднемесячная зарплата работников Могилевской области увеличилась в марте 2014 года на 4,9%.

Номинальная начисленная среднемесячная заработная плата работников Могилевской области в январе–марте 2014 года составила Br4 869,4 тыс., в том числе в марте – Br5 107,6 тыс., и увеличилась по сравнению с февралем этого года примерно на 4,9% или Br238,2 тыс. Об этом сообщили в Национальном статистическом комитете Республики Беларусь.

В Круглянском районе участились грабежи.

Трое ранее судимых жителей д. Шепелевичи Круглянского района 1985, 1986 и 1973 г.р., 22 апреля через незакрытые двери зашли в дом односельчанки, пенсионерки, 1951 г.р., и с применением насилия открыто похитили 600 000 руб. у находившегося в гостях жителя д. Смогиловка указанного района, 1958 г.р.

ПРИВАТИЗАЦИЯ ЖИЛЬЯ: КАК ВЛАСТИ «ИМЕЮТ» СВОИХ СОГРАЖДАН

Сотни, если не тысячи, жителей нашего региона занялись приватизацией своих домов и квартир. Поводом для такого коллективного порыва по разгосударствлению жилфонда стал указ президента: с 1 июля 2016 года неприватизированное жилье станет арендным. И родное белорусское государство воспользовалось тягой своих граждан заиметь во владении собственный угол и «от имело» их по полной программе.



Ну а как ещё можно назвать действия славных чиновников из Белыничского, Круглянского и Шкловского райисполкомов, которые устанавливают на приватизируемое жильё просто космические цены? После их «независимой» оценки выходит, что двадцатилетняя квартира или дом в Круглом или Большой Мощанице стоит дороже, чем новостройка под Минском. При этом зажравшиеся «слуги народа», давно обеспечившие благоустроенным жильём собственных деток и внучат, доброжелательно советуют своим простым согражданам платить и не рыпаться, - мол, инфляция всё равно съест

(Продолжение на стр. 2)

ПРИВАТИЗАЦИЯ ЖИЛЬЯ: КАК ВЛАСТИ «ИМЕЮТ» СВОИХ СОГРАЖДАН

(Продолж. Начало на стр. 1)

большую часть причитающейся к оплате суммы. Честно говоря, меня эти их советы просто прикалывают – такая вот вера со стороны чиновников в экономическую эффективность «цветущего» государства, которым они управляют. В братском им Китае да за такие слова их давно бы к стенке поставили…


Ко мне лично обращается довольно много людей с просьбой ответить на вопрос, по каким же принципам осуществляется приватизация жилья в нашем регионе, кто и каким образом определяет его стоимость.

Кто и по какой формуле должен определять стоимость объектов приватизации, прописано в постановлении Совмина. За основу берется балансовая стоимость дома по документам собственника. И вариантов, почему в свое время эта стоимость оказалась выше среднего, очень много. На дом, построенный первым, могли лечь расходы по инженерным сетям. Например, в доме в Костюковичах цена за квадратный метр вылилась в Br12 млн. Это дороже оценки БТИ в 6 раз! Дело в том, что дорогостоящая реконструкция бывшей поликлиники в жилой дом в итоге стала “золотой” для желающих приватизировать квартиры.

Даже сами наши славные чиновники зачастую не знают, как разрешить проблему, которую они же и создали. Для примера, приведу целый ряд мнений, которые были высказаны ими на телеканале ОНТ.

Олег Коробан, заместитель начальника управления КГК Могилевской области: “Если бы изначально была определена стоимость метра квадратного для приватизируемого жилья и она потом бы дифференцировалась в зависимости от износа и так далее, то у людей не возникало бы вопросов”.

Вадим Тачкин, директор консультационной компании в сфере недвижимости: “На первоначальном этапе пока не отработана система, структура (ЖКХ) старается продать повыгоднее, хотя на самом деле надо учитывать социальный аспект и слово “выгода” здесь неуместно. Здесь все-таки надо апеллировать таким понятием, как оформление в собственность ранее занимаемых помещений. Люди их не покупают, а оформляют в собственность то, чем они пользуются, и расходы, которые они несут, и фактически меняют статус, переходя из нанимателей в собственников, полезны государству”.



В Министерстве жилищно-коммунального хозяйства на подобные обращения в последнее время отвечают регулярно.

(Окончание на стр. 7)

“ШКЛОВСКИЙ МАГИСТРАТ” ПРЕДЛАГАЕТ РАЙОННЫМ ВЛАСТЯМ СОЗДАТЬ В ГОРОДЕ ЭКОНОМИЧЕСКУЮ ЗОНУ

В Шклове общественная инициатива “Шкловский магистрат” направила обращение районным властям с предложением создать в городе своеобразную экономическую зону.

Как сообщил БелаПАН глава “Шкловского магистрата” Григорий Костусев, с инициативой о создании такой экономической зоны райисполкому следует выступить перед руководством страны. В перспективе создание таких экономических зон можно было бы распространить на другие города, имевшие в прошлом Магдебургское право.

“Общественная инициатива готова представить на рассмотрение ряд своих предложений по развитию Шкловщины”, — отметил Костусев.

Кроме того, “Шкловский магистрат” предложил установить на городской ратуше таблицу с информацией о том, что в прошлом Шклов имел Магдебургское право, а 10 апреля 1762 года городу была подтверждена привилегия на создание органа самоуправления — магистрата с получением герба и печати.

Инициатива “Шкловский магистрат” была создана в районном центре 10 апреля. Одной из основных целей ее активисты определили донесение местным властям информации о возможностях экономического развития Шкловского района.

БАГДАНКЕВІЧ: БЕЛАРУСКАМУ РУБЛЮ ПАГРАЖАЕ АБВАЛ ПРАЗ РЭЦЭСІЮ ЭКАНОМІКІ РФ

Эканамічныя праблемы Расеі балюча ўдараць і па Беларусі.

Такім чынам экс-кіраўнік Нацбанка Станіслаў Багданкевіч пракаментаваў сайту charter97.org рэцэсію расейскай эканомікі.

«У нас ужо таксама ідзе рэцэсія, бо ў першым квартале адбылося падзенне аб’ёмаў прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці, скараціліся грузаперавозкі і гэтак далей. І рэцэсія расейскай эканомікі адаб’ецца адмоўна на стане эканомікі Беларусі, бо асноўнай збыт прадукцыі нашай апрацоўчай прамысловасці ідзе ў Расею. То бок, калі ў іх ідзе падзенне аб’ёмаў вытворчасці, то, адпаведна, яны будуць купляць у нас менш тавараў. У Беларусі і так ужо вялікія праблемы са збытам прадукцыі - яе рэшткі на складах велізарныя, і гэта яшчэ больш пагоршыцца», - сказаў эканаміст.

Эксперт дадаў, што будуць праблемы і з курсам беларускага рубля.



«Яны ўжо ёсць, і мы бачым, што ідзе паўзучая дэвальвацыя, асабліва ў дачыненні да еўра. Калі браць за год з лішнім, то гэты абвал склаў блізу 20%. Але я мяркую, што яна ўзмоцніцца. Калі Беларусь не атрымае абяцаных Пуціным 2 мільярдаў даляраў і 440 мільёнаў даляраў ад Антыкрызіснага фонду ЕўрАзЭС, то, безумоўна, будуць цяжкасці з плацежным балансам і магчымая разавая дэвальвацыя яшчэ на 20%. Але я не думаю, што яна будзе да хакейных баталій, але пасля іх яе можна будзе чакаць», - падсумаваў Станіслаў Багданкевіч.

Нагадаем, Мінфін РФ мяркуе, што расейская эканоміка паводле вынікаў II квартала сыдзе ў рэцэсію.

РЫГОР КАСТУСЁЎ: НАЙПЕРШ ТРЭБА ПАВЕДАМІЦЬ САПРАЎДНЫ САБЕКОШТ ГАЗУ І ЭЛЕКТРАЭНЕРГІІ

У 2015 годзе насельніцтва Беларусі будзе поўнасцю аплачваць кошт газу і электраэнергіі. Пра гэта заявіў віцэ-прэм’ер урада Анатоль Калінін. У той жа час міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Андрэй Шорац у Палаце прадстаўнікоў на адпаведнае пытанне адзначыў, што яму пра гэта нічога невядома.



Дык колькі насельніцтва будзе плаціць за газ і электрычнасць, і якія сабекошт гэтых паслугаў? З такім пытаннем мы звярнуліся да эксперта ў гэтай сферы Рыгора Кастусёва:

- Нам кажуць, што мы плацім 28 працэнтаў па сабекошце. Хтосьці кажа, што мы плацім 20 працэнтаў. Хтосьці, што мы плацім 50 працэнтаў. Таму, калі з’явіцца такое рашэнне ўрада, каб людзі плацілі 100 працэнтаў за газ і за электраэнергію, я, як грамадзянін Рэспублікі Беларусь, задаў бы пытанне: паважаныя сябры, паважаныя

(Заканчэнне на стар. 6)

А ЧТО, МОГЛО БЫТЬ ЧТО-ТО ХУЖЕ РАССТРЕЛА?

На днях Верховный суд Беларуси оставил в силе еще два смертных приговора – Александру Грунову, убившему с особой жестокостью гомельскую студентку, и Эдуарду Лыкову, признанному виновным в пяти убийствах.

О деле Грунова еще до вынесения окончательного приговора высказался Александр Лукашенко: «Если ты, негодяй и подонок, идешь и не первый раз уже совершаешь преступление, убиваешь человека, то какое право ты имеешь жить на этой земле?»

Тем не менее, правозащитники считают, что смертная казнь недопустима, независимо от того, какое преступление совершил человек. О том, почему нельзя использовать принцип «око за око», и есть ли у смертников шанс на помилование накануне важных политических событий, сайту «Товарищ.online» рассказал координатор кампании «Правозащитники против смертной казни», уроженец Белыничского района Андрей Полуда.

– Андрей, как правозащитники оценивают решения Верховного суда о применении исключительной меры в отношении Грунова и Лыкова?

– Смертный приговор мы воспринимаем очень негативно. Наша кампания выступает против смертной казни, независимо от того, что совершил человек и является он виноватым или нет.

Психологическое состояние Александра Грунова, которого в третий раз приговорили к смерти, очень тяжелое. Первый приговор Верховный суд отменил, отправив дело на пересмотр. Но затем коллегия Гомельского областного суда и Верховного суда снова вынесли решение о смертной казни. И это в третий раз услышала мать Грунова, которая присутствует на каждом судебном заседании. Ей в очередной раз было нехорошо. Это просто качели жестокости. Отмечу, что в еще 1999 году Комитет ООН по правам человека принял решение, в котором говорилось, что смертная казнь и ее процедура, существующая в Беларуси, является бесчеловечной в том числе и в отношении родителей осужденного.



По делу Лыкова ситуация немного другая. С одной стороны, он обвинялся в совершении пяти убийств, а не одного, как Грунов. Как правило, у нас приговаривают к смертной казни за два и более убийства. С другой стороны, на суде он заявил, что сотрудники милиции поили его спиртным, чтобы он сознался, угрожали, били. И в фойе суда я слышал, как сомневались, действительно ли Лыков совершил эти убийства. За одно из них уже отсидел другой человек. Затем Лыкова задержали за последнее убийство, и он взял на себя остальные четыре.

На суде прокурор сказала, что есть обстоятельства, смягчающие вину, что Лыков сотрудничал со следствием, помогал даже больше, чем была необходимость. И с учетом всех смягчающих обстоятельств попросила назначить ему наказание в виде смертной казни. Не знаю, была это профессиональная оговорка или ирония, но прозвучало это странно. А что, могло быть что-то хуже расстрела?

– Вы сказали, что в суде обсуждали, действительно ли Лыков совершил все убийства. Есть повод сомневаться в доказанности вины?

– Мы выступаем против смертной казни, и неважно, совершил что-то человек или нет. Поэтому мы никогда не говорим, что суд был некомпетентным, и вина доказана не на 100%. Но ведь любая судебная система, независимо от страны, несовершенна. Судят люди, которые могут допустить ошибку. Доказательств тому куча, даже в таких развитых странах, как США. Я лично знаком с человеком, который отсидел там 24 года. Его освободили, потому что сейчас появились возможности проведения ДНК-экспертизы, и удалось доказать, что он не виновен. Да, сейчас он получит большую компенсацию. Но если бы его расстреляли через месяц? Поэтому мы говорим, что в той ситуации, которая существует в том числе в нашей стране, если есть ошибка, то цена ее – жизнь человека.

– Президент публично комментировал дело Грунова еще до вынесения окончательного приговора. Сказав, что такой человек не может жить на этой земле, он мог повлиять на суд?

– Думаю, не стоит объяснять, каким образом воспринимаются слова президента в нашей стране. Он очень влиятельный человек, и такие конкретные прямые речи очень серьезно влияют на ситуацию. На президента

(Продолжение на стр. 5)

А ЧТО, МОГЛО БЫТЬ ЧТО-ТО ХУЖЕ РАССТРЕЛА?

(Продолж. Начало на стр. 4)

ссылалась и мать жертвы, которая на последнем заседании Верховного суда сказала: «Примите правильное решение, чтобы мне снова не обращаться к президенту». Конечно, такие вещи серьезно влияют на ситуацию.

– Теперь у приговоренных к смерти остаются две последние возможности – обратиться в Комитет ООН по правам человека и написать прошение о помиловании на имя президента. Что они уже предприняли?

– Сразу после вынесения приговора Грунов сказал, что не будет обращаться к президенту, потому что не верит в этот институт. Это неудивительно. Президент у нас только раз за всю историю использовал свое право помиловать осужденного на смертную казнь. Однако позже на свидании с матерью он сообщил, что все же напишет прошение, использует этот шанс. Но учитывая сказанное президентом по его делу, надежд мало.

Лыков вообще не собирался даже подавать кассацию. Он отказался от юридической помощи. Всех адвокатов – их было три – ему назначили. На последнем заседании адвокат сказал всего два или три слова о том, что поддерживает кассацию – и все. Кассацию Лыков написал собственноручно, воспользовавшись этой возможностью только для того, чтобы, как он объяснил, до расстрела встретится со своей живущей в Германии дочерью, которая в письмах обещала приехать.

Он не хочет обжаловать решение суда в Комитет ООН по правам человека. И писать прошение о помиловании не планирует тоже. Человек уже не цепляется за последнюю надежду.

– Шансов на помилование, как видим, ничтожны. Но впереди значительные события – ЧМ по хоккею и начало президентской кампании. Можно ли рассчитывать, что президент все же помилует осужденных, рассчитывая набрать побольше политических очков?



– Даже если шанс один из тысячи, думаю, стоит обращаться с просьбой о помиловании. К сожалению, ситуацию по Грунову президент уже прокомментировал. Не знаю, сможет ли он изменить свою позицию. Дело Лыкова, даже если он не обратится к президенту, все равно будет рассматривать комиссия по помилованию: такова процедура. Но даже несмотря на такие важные события, шансы очень невелики.

Правда, бытует такое мнение, что приговоры не будут приводиться в исполнение, пока не закончится чемпионат мира по хоккею. Такие надежды есть и у родственников осужденных. Но чемпионат не за горами, и он быстро закончится. И тогда этот конвейер смерти продолжится.

– Известно, что за одно из убийств, совершенных Лыковым, отсидел другой человек – Михаил Гладкий. Сразу вспоминается витебское дела маньяка Михасевича, по которому невиновный человек был расстрелян, еще несколько – отсидели сроки. Выходит, такие серьезные ошибки следствия и суда не остались в далеком прошлом?

– Ситуация с Михаилом Гладким очень показательная. В рамках кампании мы проводим много дебатов, дискуссий, встречаемся со студентами. И когда приводишь пример дела Михасевича, молодые люди воспринимают это так: все это было в другой стране, в другое время, и нас это никогда не касалось и не коснется. Но пример Гладкого показывает, что это может и сейчас произойти с любым человеком. Изначально его обвиняли в двойном убийстве и могли расстрелять. Потом переквалифицировали на одно, хотя он не совершал ни одного. Ему дали 8 лет, он отсидел 5 и плюс еще 2 года исправработ, выплатил государству Br26 млн по тем деньгам. Сейчас мы работаем с ним в рамках кампании, чтобы Михаил мог получить компенсацию. Слава богу, что человека реабилитировали. Но ведь могли расстрелять невиновного. И сколько таких Гладких сейчас в нашей стране, остается только догадываться.

– Аргументы противников смертной казни понятны. Но нельзя не замечать и аргументов родственников убитых, которые требуют возмездия за своих близких…

– Если мы убиваем убийцу, то

(Окончание на стр. 6)

ШКОЛЬНЫЯ ПЕСНІ НА РОДНАЙ МОВЕ

Якія песні гучаць сёння на школьных мерапрыемствах? На жаль, акрамя «Учат в школе» і «Когда уйдем со школьного двора», якія пелі яшчэ ў мінулым стагоддзі, больш нічога не ўспомніш. Яшчэ горш справы са школьнымі песнямі на роднай мове.



Юрый Несцярэнка

Адным з самых цікавых праектаў, якія з'явіліся ў апошнія гады ў акрэсленым накірунку, можна назваць «Альбом школьных песень». І гутарка сёння з яго арганізатарам, удзельнікам, натхняльнікам – бялыніцкім музыкам Юрыем Несцярэнкам.

– Юрый, вас ведаюць у Беларусі ў першаю чаргу як блюз-рокавага музыканта. Вельмі нечакана было дазнацца пра тое, што вы ўдзельнічаеце ў працэсе стварэння школьнага рэпертуару. Як адбылося перасячэнне такіх розных творчых шляхоў?

– Пачнем з таго, што па адукацыіі я з'яўляюся менеджарам-культуролагам, што дазваляе мне думаць пра любую творчую справу, за якую я бяруся, катэгорыямі культуралагічнай прасторы. Аднойчы з'явілася першая інфармацыя ад знаёмых выкладчыкаў, што вось, маўляў, у Валожыне добрыя аўтары напісалі нядрэнную школьную песню, ды няма каму праспяваць. А ў іншым горадзе – з'явіўся твор, дзе і словы, і музыка класныя, ды праблема з аранжыроўкай і магчымасцямі студыйнага запісу. А ў трэцім горадзе жывуць выканаўцы і музыканты, якім цікава паўдзельнічаць у такой справе. Тады і прыйшло разуменне таго, што трэба рабіць закончаную праграму: запрашаць да ўдзелу ў працы аўтараў музыкі і вершаў, музыкантаў, выканаўцаў, гукарэжысёраў і аб'ядноўваць іх агульнай ідэяй – ідэяй стварэння «Альбома школьных песень».

– З ідэямі зразумела! А на практыцы – дзе і якім чынам працягвалася праца?

– Са студыяй дамаўляліся ў Мінску. Спачатку давялі да ладу чатыры першыя песні: дарабілі, аранжыравалі, запісалі. Потым праца так захапіла, што ўзнікла патрэба напісаць яшчэ шэраг песень. Урэшце атрымалася дзесяць паўнавартасных трэкаў. Калі пачалі рыхтаваць да выпуску дыск, да асноўных трэкаў дадалося дзесяць «мінусовак», якія разлічаны на самастойную працу ў дзіцячых калектывах.

– Кажуць, што склад удзельнікаў альбома можна назваць усебеларускім ці нават інтэрнацыянальным. Ці так гэта?

– Сапраўды, музыканты, аўтары, гукарэжысёры – жыхары розных гарадоў Беларусі: Наваполацка, Мінска, Магілёва, Бялынічаў, Клічава, Салігорска, а таксама беларусы, якія зараз жывуць далёка за межамі краіны.

(Заканчэнне на стар. 7)

РЫГОР КАСТУСЁЎ: НАЙПЕРШ ТРЭБА ПАВЕДАМІЦЬ САПРАЎДНЫ САБЕКОШТ ГАЗУ І ЭЛЕКТРАЭНЕРГІІ

(Заканч. Пачатак на стар. 3)

ўрадоўцы, паважаныя міністры, дык паведамце мне сапраўдны сабекошт газа і сапраўдны сабекошт электраэнергіі. Таму што ў Беларусі да гэтай пары не вызначаная канкрэтная сума, або канкрэтны кошт на гэтыя паслугі.

Паводле міністра Андрэя Шораца, яму вядома толькі тое, што на камунальныя паслугі магчыма ў пачатку года "падняць тарыфы на 5 даляраў плюс індэксацыя"."Больш нічога не ведаю і каментаваць не магу", - заявіў міністр.

Яна Запольская

А ЧТО, МОГЛО БЫТЬ ЧТО-ТО ХУЖЕ РАССТРЕЛА?

(Оконч. Начало на стр. 4, 5)

меньше их не становится, все равно кто-то это делает. Скорее наоборот, мы сами задействуем в убийствах целый институт. Например, по делу Грунова три судебные коллегии выносили решение о смертной казни. Это девять разных людей. Вместо одного убийцы мы получаем нескольких: прокурор, который поддерживает обвинение, судьи, которые выносят решение, люди, которые приводят приговор в исполнение.

В свое время Ганди сказал очень важную вещь: если использовать принцип «око за око», то мир станет слепым. Мы не должны допустить, чтобы мир ослеп.

«Товарищ.online»

ШКОЛЬНЫЯ ПЕСНІ НА РОДНАЙ МОВЕ

(Заканч. Пачатак на стар. 6)

Усе гэтыя людзі паставіліся неабыякава да неабходнасці ствараць самастойны школьны рэпертуар.

– Якія тэмы закранаюцца ў гэтым рэпертуары, прасцей кажучы – пра што песні?

– Песні закранаюць увесь спектр школьнага жыцця. Тут ёсць і «Першыя ўрокі», і «Нашы настаўнікі», і «Школьны вальс», і «Вальс развітання». А таксама – «Дырэктар школы», «Школьная настальгічная», «Самая прывабная», «Лета», «Апошні дзень». Тэксты песень – ад святочных, прывітальных да шчымліва-самотных, ад «сур'ёзных» да іранічных.

– Калі дыск з'явіўся? Як вы яго прапаноўвалі слухачам, дакладней, сваёй мэтавай аўдыторыі – настаўнікам і вучням?

– Мы вельмі хацелі выпусціць наш альбом да пачатку навучальнага года. Ён якраз і з'явіўся 1 верасня 2012-га. У перыяд з восені 2012-га па восень 2013-га мы зрабілі шэраг прэзентацый па Беларусі і нават за яе межамі. Мы пабывалі з канцэртамі ў Маладзечне і Маладзечанскім раёне (мястэчка Чысць), у Клічаве (падчас летніх канікулаў выступалі ў лагеры адпачынку) і Бялынічах (музей Бялыніцкага-Бірулі), у Буйніцкай школе, а таксама ажыццявілі незабыўную паездку ў Вільню, дзе выступілі ў беларускай гімназіі імя Францыска Скарыны.

– Ці ёсць вынікі, ці ёсць зваротная сувязь з вашымі слухачамі?

– Вельмі шмат нумароў на дадзены момант ужо выконваюць дзеці. І нават да некаторых прэзентацый былі падрыхтаваныя – мы прэзентавалі альбом, а юныя выканаўцы адразу ж выконвалі песні з яго. Асабліва прыемна было, калі дзеткі з Віленскай гімназіі заспявалі са сцэны нашы песні.

– Напрыканцы размовы традыцыйнае пытанне – што плануеце рабіць далей?

– На дадзены момант скончаны першы этап нашай працы – мы стварылі сігнальную версію альбома і паказалі яго дастаткова вялікай аўдыторыі. Цяпер, пасля таго, як убачылі, якія творы больш цікавыя для нашых слухачоў, якія песні трэба перазапісаць, мы плануем перавыданне альбома з выкарыстаннем мульцімедыя-матэрыялаў: з тэкстамі песень, з фота- і відэаздымкамі, з новымі песнямі. Спадзяёмся, што гэта будзе ўжо іншы ўзровень.

Вікторыя Аляксандрава, “Магілёўская праўда”

ПРИВАТИЗАЦИЯ ЖИЛЬЯ: КАК ВЛАСТИ «ИМЕЮТ» СВОИХ СОГРАЖДАН

(Оконч. Начало на стр. 1, 2)

Разъясняют и только: рассчитывать цену метров ведомство не уполномочено, за это отвечают местные исполкомы. Стоимость приватизируемого жилья рассчитывают по одной и той же формуле уже 15 лет. В основе – балансовая стоимость, умноженная на индексы, как у строителей нового жилья. Также учитывают процент износа, этажность и даже расположение конкретного дома. Отсюда и такое отличие от расчетов БТИ, которые учитывают цены на недвижимость в конкретном населённом пункте.

Константин Куликов, консультант управления жилищного хозяйства Министерства жилищно-коммунального хозяйства Беларуси: “Законодательство не предусматривает возможности снижения или повышения цены в зависимости от того, что здесь дешево, здесь дорого. Надо смотреть изначально документы, в какие денежные средства обошлось государству строительство данного дома”.

То есть, уважаемые читатели, многие из чиновников хорошо понимают, что старая квартира в Белыничах не может стоить дороже новой в Минске. Но деньги в бюджет родной страны требуются, поэтому на людей им, собственно, начхать, лупят цены по балансовой стоимости, что в агрогородке, что в областном центре. Про то, сколько затрат «на бумаге» вбухивали в строительство жилья в деревнях наши славные строители, и сколько за счёт сельчан было «отмыто» денег для наших мудрых руководителей и их деток, вы лучше меня знаете. Хотите знать лучше – расспросите своих знакомых тружеников строительных организаций нашего региона. Они вам столько интересного расскажут…


Ну а для того, чтобы иметь возможность оспорить ту цену, которую вам насчитали «слуги народа» из райисполкома, обязательно проведите независимую оценку стоимости своего жилья – с помощью тех же специалистов БТИ, например. Славные чиновники будут рассказывать вам сказки о том, что, мол, такую оценку проводить не стоит, всё равно она не имеет силы, и т. д., и т. п. Во многом они, конечно, правы, однако, имея на руках независимую оценку стоимости приватизируемого жилья, вы сможете аргументированно отстаивать свою позицию в суде или в вышестоящих инстанциях, куда вам всё равно придётся обращаться.

Иван Борисов

PS. На конец 2013 года в Беларуси насчитывалось 392 тыс. неприватизированных квартир, или 14% от общего количества жилья. В Могилевской области неприватизированным остается порядка 20% жилфонда.

РЭКЕТ ПА-БЯЛЫНІЦКІ

У апошнія дні бялыніцкія прадпрымальнікі пачалі атрымліваць уведамленні з мясцовага райвыканкама, у якіх ім прапануецца пералічыць грашовыя сродкі на добраўпарадкаванне гарадскога пасёлка Бялынічы.



Во исполнение решения Белыничского районного исполнительного комитета от 31 марта 2014 г. № 7-8 «О проведении районного субботника» Вам необходимо до 20 мая 2014 г. перечислить денежные средства в размере [illegible] рублей на счет № [illegible] в Центре банковских услуг № 701 г.п.Белыничи филиала № 700 г.Могилёв открытого акционерного общества «Сберегательный банк «Беларусбанк», получатель Белыничский районный исполнительный комитет, УНП [illegible], МФО [illegible].

Денежные средства будут направлены на благоустройство г.п.Белыничи.

Заместитель председателя
Белыничского райисполкома Н.С.Серикова

У прыватнасці, у гэтых уведамленнях, якія падпісаны намеснікам старшыні Бялыніцкага райвыканкама Надзеяй Серыкавай, гаворыцца:

"У выкананне рашэння Бялыніцкага раённага выканаўчага камітэта ад 31 сакавіка 2014 г. №7-8 "Аб правядзенні раённага суботніка" Вам неабходнада 20 траўня 2014 г. пералічыць грашовыя сродкі ў памеры (называецца сума – з. р.) рублёў на рахунак №3641061580877 у Цэнтры банкаўскіх паслуг №701 г. п. Бялынічы філіяла №700 г. Магілёў адкрытага акцыянернага таварыства "Ашчадны банк "Беларусбанк", атрымальнік Бялыніцкі раённы выканаўчы камітэт, УНП – 700081616, МФО 153801536.

Грашовыя сродкі будуць накіраваныя на добраўпарадкаванне г. п. Бялынічы".

Так, бялыніцкаму прадпрымальніку Алегу Мяцеліцу, як і многім іншым, Надзея Серыкава прапанавала пералічыць на райвыканкамаўскі рахунак 200 000 рублёў.

Бялыніцкі журналіст Барыс Вырвіч адзначае, што апошнім часам прымусовая праца ў Бялынічах стала нормай.

"З пачаткам цёплых дзён у Бялыніцкім раёне бесперапынна праходзяць разнастайныя суботнікі і "дні навядзення парадку на зямлі", - распавядае Барыс Вырвіч. – Самая цікавае, што людзей, якія добрасумленна адпрацавалі на суботніках, потым яшчэ і прымушаюць "добраахвотна" здаць грошы з уласнага заробку за гэта сумнеўнае задавальненне. І людзі ў большасці здаюць, бо баяцца, што ўзнікнуць праблемы на працы (пра гэта іх часцяком папярэджваюць непасрэдныя кіраўнікі).

Супрацоўнікаў бюджэтных арганізацый Бялыніцкага раёна зараз амаль кожны дзень адпраўляюць задарма папрацаваць у сельгаспрадпрыемствах альбо на добраўпарадкаванні тэрыторыі раёна, для гэтага складзены адмысловыя графікі. На парушэнні працоўнага заканадаўства мясцовыя ўлады ніякай увагі не звяртаюць, маўчыць і пракуратура Бялыніцкага раёна. Людзі адстойваць свае правы таксама баяцца, бо знайсці нейкую прыстойную працу ў Бялыніцкім раёне вельмі цяжка.

Зараз вось пачалі здзіраць грошы з прадпрымальнікаў і прыватных прадпрыемстваў, абсалютная большасць з іх ужо атрымала адпаведныя ўведамленні. Між тым практычна ўсе прадпрымальнікі ўжо ўклалі значныя грошы ў рамонт і добраўпарадкаванне тэрыторыі каля сваіх аб'ектаў, за ўласны кошт пафарбавалі агароджы, адпрацавалі на суботніках і г. д. Рэкет па-бялыніцкі будзе працягвацца, пакуль людзі не перастануць паддавацца на шантаж мясцовых уладаў і не пачнуць адстойваць свае правы", - выказвае меркаванне Барыс Вырвіч.

Неабходна адзначыць, што старшыня Бялыніцкага райвыканкама Мікалай Кадаценка, які быў прызначаны на сваю пасаду восенню мінулага года, да гэтага прызначэння шмат гадоў працаваў старшынёй Чэрыкаўскага райвыканкама. Яшчэ падчас працы ў Чэрыкаўскім раёне Мікалай Міхайлавіч вызначаўся пастаянным навядзеннем парадку і чысціні на тэрыторыі раёна з выкарыстаннем прымусовай працы, нейкіх значных поспехаў у галіне эканомікі Чэрыкаўскі раён пад яго кіраўніцтвам так і не дасягнуў.

Зараз прымусовая праца стала нормай і для Бялыніцкага раёна.

Сяргей Семяновіч

БАЦЬКОЎ ШКОЛЫ Ў КРУГЛЫМ ПРОСЯЦЬ «СКІНУЦЦА» НА МУЗЕЙ

Школьнікаў, чые бацькі адмовіліся ўнесці грошы, падвяргаюць пераследу.

Пра гэта паведаміў чытач сайта charter97.org, які даслаў у рэдакцыю копію ліста, у якім змяшчаецца просьба прафінансаваць стварэнне гісторыка-краязнаўчага музея ў школе № 1 пасёлка Круглае ў Магілёўскай вобласці. Бацькоў просяць перавесці для гэтага 100 тысяч рублёў. У лісце пазначаныя банкаўскія рэквізіты і просьба зрабіць перавод да 10 траўня. Ён падпісаны дырэктарам школы А.М.Бялянкіным і старшынёй апякунскай рады А.Н.Рагаўніцкім.

«Вельмі многім бацькам гэта не даспадобы, але калі за сваё дзіця бацька не ўнёс грошы, пачынаюцца ўсялякія праследы вучняў з боку настаўнікаў з маўклівага адабрэння дырэктара. Гэта нахабства вышэйшай катэгорыі. І такія паборы паўсюдныя: дні нараджэння настаўнікаў, рамонт класаў і гэтак далей», - паведаміў чытач.

Анекдот дня

Весна! Так хочется влюбиться… но муж против.

Я бы никому не завидовал, но жена заставляет...

Рэгіён

Грамадска-палітычная газета.
Выдаецца на беларускай і рускай мовах, распаўсюджваецца бясплатна. Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.

Надрукавана на ўласным абсталяванні па адрасе: 213173, Магілёўская вобл., Бялыніцкі р-н, аг-к Вялікая Машчаніца, вул. Савецкая, д. 4. Тэл. 8 (02232) 37-365. Наклад 299 асобнікаў. Выдавец Вырвіч Барыс Іванавіч. Падпісана ў друк 01.05.2014 г. у 21-00.